

СТАЦЬ ЧАСТКАЙ НОВАЙ СЯМ'І: ПАРАДЫ ПСІХОЛАГА

Сямейная газета

ЯК ВЫРОШЧВАЦЬ СПАРЖУ? 16




Выдаецца з 9 жніўня 1917 г.

Родная газета на роднай мове

# ЗВЯЗДА

4 КРАСАВІКА 2024 г. ЧАЦВЕР № 67 (30201)


## ЦЫТАТА ДНЯ



**Руслан ПАРХАМОВІЧ, міністр архітэктуры і будаўніцтва:**

*«Разгледжаны змены па крэдытаванні, магчымасці ўзмацнення пазіцый па іпатэчным крэдытаванні на рынку Беларусі. Вядзецца работа па падрыхтоўцы да разгляду на Прэзідыуме Савета Міністраў тактычных планаў, якія дадуць магчымасць забяспечыць увод жылля, у тым ліку з дзяржпадтрымкай на 2024—2025 гады, а таксама стратэгічныя планы, якія будуць выкладзены ў пастанове Саўміна ў рамках канцэпцыі жыллёвай палітыкі да 2030 года. У нас ёсць дастаткова сур'ёзныя інструменты для дзяржаўнай падтрымкі нашых грамадзян, але ёсць пэўная частка насельніцтва, якая мае патрэбу ў паляпшэнні жыллёвых умоў, аднак не мае права на атрыманне дзяржпадтрымкі ў тым выглядзе, у якім яна сёння афармлена ва ўказах нумар 13 і нумар 240. Якраз вось гэтая частка насельніцтва і разглядалася ў якасці патэнцыяльнага спажыўца іпатэчнага прадукту».*

# Залік па прыгажосці



Фота Віктара ІВАНЧЫКАВА.

У Мінскім дзяржаўным тэхналагічным каледжы навучэнцы асвойваюць запатрабаваныя прафесіі, у прыватнасці цырульніка. Прычым на практычных занятках выступаюць як у ролі майстра, так і ў ролі мадэлі. Як, напрыклад, навучэнкі трэцяга курса Надзея ТРУБІНА і Ксенія ШАРАКАПЫТАВА, якія падчас гэтай здымкі асвойвалі на практыцы мадэляванне прычосак з выкарыстаннем пастыжэрных вырабаў.

## КОРАТКА

- **У мінулым годзе колькасць авіярэйсаў паміж Беларуссю і Расіяй павялічылася ўдвая.**
- СЭЗ «Мінск» і ГПП Смаленскай вобласці падпісалі пагадненне аб супрацоўніцтве.
- **Кітайская кампанія VIA Technology Import and Export Limited, акрэдытаваная БУТБ у якасці біржавога брокера, мае намер садзейнічаць арганізацыям-імпарцёрам з краін далёкай дугі ў пытаннях закупак беларускіх тавараў на біржавых таргах.**


ISSN 1990 — 763X


Парламенцкі дзённік

## «Адчуваць пульс грамадства і быць у гушчы падзей»

### Дэпутаты выбралі старшыняў пастаянных камісій і сфарміравалі састаў Савета Палаты прадстаўнікоў Нацыянальнага сходу восьмага склікання

**Звяртаючыся да парламентарыяў, Старшыня Палаты прадстаўнікоў Ігар СЕРГЕЕНКА адзначыў, што выбранне старшыняў пастаянных камісій — гэта пытанне арганізацыі эфектыўнага рабочага працэсу ў Палаце прадстаўнікоў, накіраванага на вырашэнне тых задач, якія былі пастаўлены кіраўніком дзяржавы. Па яго словах, прыярытэты нашай прававой палітыкі застаюцца нязменнымі — забеспячэнне суверэнітэту і бяспекі, эфектыўная эканоміка і выверана сацыяльная палітыка.**

СТАР. 2

АПК

## СЯЎБА НАБІРАЕ ХУТКАСЦЬ



**Сяўба сёлета пачалася на два тыдні раней у сувязі з кліматычнымі ўмовамі, таму і тэмпы работ дастаткова нядрэнныя. Як адзначыў намеснік міністра сельскай гаспадаркі і харчавання краіны Уладзімір ГРАКУН, паўднёвыя рэгіёны скончаць гэтую работу яшчэ да канца тыдня. Ставіцца задача ў найбліжэйшыя 7-8 дзён падысці да завяршэння сяўбы гэтых ранніх культур і перайсці да яравога рапсу, а пасля прыступіць да кукурузы, каб да 9 мая завяршыць усе пасяўныя работы. Дарэчы, у краіне ўжо пачалі сеяць лён і цукровыя буракі.**

СТАР. 3